Ззялі Божай дабрынёй і адданасцю

Аўтар: Кінга Красіцкая
26.07.2020 00:00



1 жніўня 1943 года пад Навагрудкам нямецкімі акупантамі былі расстраляны с. Стэла і 10 яе паплечніц з Кангрэгацыі Сясцёр Найсвяцейшай Сям'і з Назарэта. Кожная з іх несла ў сабе адметнае адценне вопыту, чуласць і непаўторную форму духоўнай прыгажосці. С. Канізія

Вучыла дзяцей у Навагрудку рэлігіі, асновам арыфметыкі, польскай мове, а таксама рукадзеллю: мастацкай вышыўцы і цырaванню. Была патрабавальнай і строгай. Вучні называлі яе "сястра Дысцыпліна", але ўсё роўна любілі і паважалі. †



Мела цікавую выхаваўчую практыку: насіла з сабой скрынку з пшанічнымі зярнятамі. Пытала дзяцей, ці зрабілі яны якую-небудзь добрую справу. Калі хтосьці адказваў "так", мог узяць адпаведную колькасць зярнят і пакласці іх у іншую скрынку. Збожжа са скрынкі "добрых учынкаў" перамолвалася ў муку, з якой выпякалі гостыі. Такім чынам дзеці заахвочваліся да здзейснення як мага большай колькасці добрых спраў.

С. Геліадора

Аўтар: Кінга Красіцкая
26.07.2020 00:00





Аўтар: Кінга Красіцкая
26.07.2020 00:00



